# ДА ПРАБЛЕМЫ ВЫЛУЧЭННЯ ПАНЯЦЦЯ *ЧЫТАЦКАЯ ГРАМАТНАСЦЬ*

***Жэўно Т. Л.*** *(УО БДПУ імя М. Танка, Мінск)*
***Навуковы кіраўнік*** *– А. С. Васілеўская, канд. філал. навук, дацэнт*

На змену эпосе, калі кнігі чыталіся ў вялікай колькасці і з'яўляліся практычна асноўнай крыніцай разнастайных ведаў, прыйшоў час новых інфармацыйных тэхналогій і сістэм. Павялічваюцца аб'ёмы інфармацыі, расце значэнне інфармацыі ў жыцці грамадства, мяняюцца метады работы з ёй, пашыраецца сфера выкарыстання новых інфармацыйных сістэм. “Таму перад соцыумам сёння паўстае важная задача – падрыхтаваць чалавека да новых умоў жыцця і прафесійнай дзейнасці, навучыць яго самастойна дзейнічаць у інфармацыйным асяроддзі, эфектыўна выкарыстоўваць яго магчымасці і абараняцца ад яго негатыўнага ўздзеяння” [1, 3].

Змены ў грамадстве ставяць новыя задачы і перад навучальнымі ўстановамі: знайсці новыя спосабы і метады выхавання ўсебакова развітой асобы з маральна-этычнымі каштоўнасцямі і крытычным мысленнем, здольнай да ўзаемадзеяння з сучасным навакольным светам. З'яўляецца неабходнасць не толькі ў павелічэнні якасці адукацыі, але і пастаяннага маніторынгу функцыянальнай граматнасці навучэнцаў.

Намаганнямі міжнароднай экспертнай супольнасці былі створаны два тэсты PIRLS і PISA (Programme for International Student Assessment) для вылучэння ўзроўню ведаў і ўменняў, неабходных для функцыянавання ў сучасным грамадстве. У міжнародных даследваннях 2015 г. прынялі ўдзел 72 краіны свету. Асаблівая ўвага надавалася вызначэнню узроўню чытацкай граматнасці дзяцей і падлеткаў [2].

Упершыню паняцце *чытацкая граматнасць*, якім называюць здольнасць асобы разумець, выкарыстоўваць і інтэрпрэтаваць інфармацыю з літаратурных і навукова-папулярных тэкстаў, уменне працаваць з рознымі графікамі, дыяграмамі, табліцамі і схемамі, з'явілася ў кантэксце міжнароднага тэсціравання ў 1991 г. Для Беларусі яно з'яўляецца новым, недастаткова распрацаваным, пра што сведчаць розныя спосабы перакладу тэрміна – *чытацкая граматнасць* і *чытацкая пісьменнасць*. На нашу думку, больш правільным будзе выкарыстанне тэрміна *чытацкая граматнасць*. Тлумачальны слоўнік падае да слоў аднолькавыя азначэнні: ‘уменне чытаць і пісаць’ і перан. ‘наяўнасць патрэбных ведаў у якой-н. галіне’. Аднак выразная ўнутраная форма слова *пісьменнасць* абумоўлівае ўжыванне пераважна ў прамым значэнні. Слова *граматнасць* такой выразнай унутранай формы не мае, таму мы лічым, што гэтае паняцце мае больш шырокое значэнне.

Паказчыкі сфарміраванасці чытацкай граматнасці з'яўляюцца спецыфічнымі для кожнага этапа навучання. Вымяральнікам чытацкай граматнасці ў 4 класе з'яўляецца тэст PIRLS, пры дапамозе якога ацэньваецца здольнасць здабываць інфармацыю з тэксту, інтэрпрэтаваць яе, ацэньваць форму і змест тэксту, фіксаваць невядомае, задаваць пытанні пра незразумелае, самастойна шукаць недастатковую інфармацыю. Вымяральнікам чытацкай граматнасці ў 9 класе з'яўляецца тэст PISA, якім ацэньваюцца навыкі крытычнага чытання, якія фарміраваліся на працягу перыяду навучання ў асноўнай школе. Беларусь плануе ўдзельнічаць у міжнароднай праграме па ацэнцы адукацыйных дасягненняў PISA, якая будзе праводзіцца ў 2018 г., у цэнтры ўвагі якой будзе менавіта чытацкая граматнасць.

Сфарміраванасць чытацкай граматнасці дзяцей і падлеткаў – хвалюючае пытанне сучаснасці. Галоўнай праблемай з'яўляецца адсутнасць у дзяцей і падлеткаў цікавасці да чытання ўвогуле. Сучасныя дзеці чытаюць не толькі менш, але і значна горш, чым іх равеснікі 20–30-х гадоў назад.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Адзначаецца найбольшая зацікаўленасць дзяцей і падлеткаў візуальнай інфармацыяй, захапленне інтэрнэтам, кіна-, відэа- і тэлепраграмамі. У выніку ў дзяцей празмерна развіта “кліпавае” мысленне, у памяці прысутнічаюць толькі асобныя вобразы, апісаць якія ім не хапае ні моўнага запасу, ні выпрацаваных навыкаў.

Па выніках даследвання, праведзенага Нацыянальным інстытутам адукацыі ў адпаведнасці з загадам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 09.09.2014 г. № 701 “Аб правядзенні маніторынгу якасці агульнай сярэдняй адукацыі 2014/15 гг.”, да 70 % васьмікласнікаў не спраўляюцца з заданнямі, у якіх патрабуецца інтэграваць і інтэрпрэтаваць інфармацыю, аналізаваць і ацэньваць змест тэксту. Значныя цяжкасці ўзнікаюць пры рабоце з беларускімі тэкстамі. Вучні не ведаюць лексікі беларускай мовы, пры адказах блытаюць словы рускай і беларускай мовы [3]. У сувязі з гэтымі рэаліямі ў краіне і ва ўсім свеце інтэнсіўна ідзе пошук шляхоў узнаўлення цікавасці да чытання і новых методык фарміравання чытацкай граматнасці.

Такім чынам, распрацоўка паняцця чытацкая граматнасць патрабуе дакладнага акрэслення паняцця, вызначэння найбольш эфектыўных методык выпрацоўкі асноўных крытэрыяў чытацкай граматнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Літаратура

1. Азарка, В. У. Да праблемы фарміравання інфармацыйнай культуры будучых настаўнікаў пачатковых класаў / В. У. Азарка, А. С. Васілеўская // Намінатыўныя і функцыянальныя аспекты вывучэння мовы і маўленчай дзейнасці ў школе і ВНУ : зб. навук. арт. / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Брэсц. дзярж. ун-т імя А.С. Пушкіна, каф. рус. і беларус. моў з методыкай выкладання : рэд. кал.: Г. М. Канцавая [і інш.]. – Брэст, 2011. – С. 3–5.

2. Цукерман, Г. А. Становление читательской грамотности, или Новые похождения Тяни-Толкая / Г. А. Цукерман [і інш.] // Вопросы образования. – 2015. – № 1. – С. 284–300.

3. Рекомендации по совершенствованию читательских умений учащихся учреждений общего среднего образования [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.adu.by/ru/instytut/otsenka-kachestva-obrazovaniya.html. – Дата доступа: 5.04.2017.